часу ЕС стаў актыўна развіваць эканамічныя адносіны з Іракам і выдаткаваў нямалыя сумы на яго аднаўленне, што цалкам упісваецца ў еўрапейскую палітыку ўмацавання сваіх пазіцый у блізкаўсходнім рэгіёне. У той жа час пазіцыя Злучаных Штатаў заключалася ў тым, каб максімальна ўцягнуць свайго бліжэйшага саюзніка ў ажыццяўленне праектаў па аднаўленні, дзе самі амерыканцы мелі абмежаваныя магчымасці і матэрыяльныя цяжкасці пры выкананні гэтага выключна ўласнымі сіламі. Але пры гэтым ЗША імкнуліся не страціць свае пазіцыі і не выпусціць стратэгічную ініцыятыву ў краіне і рэгіёне ў цэлым, што вымушала іх уносіць пэўныя карэктывы ў сваю палітыку.

**Літаратура**


1. A Framework for EU-Iraq Engagement [Electronic Resourse]. – Mode of access: http://europa.eu/legislation_summaries/external_relations/relations_with_third_countries/middle_east/r16005_en.htm. – Date of access: 04.06.2010.
2. Deep Divisions over Iraq at NATO's Istanbul Summit // Disarmament Diplomacy [Electronic Resourse]. – Issue No. 78. – July/August 2004. – Mode of access: http://www.acronym.org.uk/dd/dd78/78news01.htm. – Date of access: 04.06.2010.
3. EU-Iraq Joint Declaration on Political Dialogue. Brussels, 2005.
4. EU-U.S. Declaration of Support for the People of Iraq. Dromoland Castle, 2004.
5. Iraq: Foreign Contributions to Stabilization and Reconstruction. Congressional Research Service, RL32105, 2007.
6. Iraq: Madrid Donor Conference // Council on Foreign Relations [Electronic Resourse]. – Mode of access: www.cfr.org/publication/7682/iraq.html. – Date of access: 04.06.2010.
7. Launching of EUJUST LEX, ESDP Integrated Rule-of-Law Mission for Iraq. Brussels, General Secretariat of the Council of the European Union, 2005.


## ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯЦЕЙ-СІРОТ НА АКУПІРАВАНЫХ ПОЛЬСКІМІ ВОЙСКАМІ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1919–1920 ГАДАХ


**В. М. Бароўская**


Хаас часу, вядзенне ваенных дзеянняў на беларускіх землях, складанасці эканамічнага характару выклікалі шматлікія сацыяльныя праблемы. Грамадства, якое за гады вайны звыклася з бесчалавечнымі адносінамі, сітуацыяй, калі чалавечае жыццё каштавала вельмі танна, або наогул нічога не каштавала; з абыякавасцю навакольнага асяроддзя да сваёй асобы, безабароннасцю, з шматлікімі складанасцямі матэрыяльнага забеспячэння. У такой сітуацыі праблемы дзяцей-сірот проста ігнараваліся, ці вырашаліся ў абмежаваным маштабе. Між тым сітуацыя страты бацькоў (у выніку вядзення ваенных дзеянняў, з-за распаўсюджанасці вострых эпідэмных захворванняў сярод насельніцтва і па іншым прычынам) была распаўсюджанай з'явай.

Савецкая ўлада з-за недахопу сродкаў фінансавання, неабходнага часу

для вырашэння праблемы, не здолела арганізаваць дзейснай сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва. Планавалася стварыць савет абароны дзяцей пры Народным камісарыяце асветы. У зародкавым выглядзе засталася ідэя стварэння наладжанай сістэмы дзіцячых ачагоў і прытулкаў. Праект заснавання філіяла Лігі выратавання дзяцей – распаўсюджанай грамадскай арганізацыі, філіялы якой былі створаны ў шматлікіх населеных пунктах былой Расійскай імперыі, не быў рэалізаваны з-за адсутнасці неабходных сродкаў, праблемы каардынацыі дзеянняў цэнтральнай арганізацыі з мясцовымі філіяламі па прычыне вядзення ваенных дзеянняў на беларускіх землях.

Адыход савецкіх войскаў і захоп беларускіх зямель польскімі бокам замарудзілі працэс вырашэння дадзенай праблемы, але не знялі яе. Вырашэнне праблемы дзяцей-сірот у адзначаны перыяд ажыццяўлялася дзякуючы функцыянаванню дзіцячых прытулкаў, заснаваных да 1917 года (80% ад агульнай колькасці), дзіцячых ачагоў, створаных па ініцыятыве савецкай улады (20%) [1, л. 5]. Фінансаванне дадзеных устаноў падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гадоў ажыццяўлялася дзяржаўным і прыватным чынам. Польскі акупацыйны апарат кіравання, створаны на захопленых беларускіх землях, выдаткоўваў сродкі на вырашэнне праблем дзяцей-сірот праз мясцовыя органы кіравання. Але паступаўшыя сродкі не забяспечвалі нармальнага функцыянавання дзіцячых прытулкаў.

Яскравым прыкладам дзяржаўнага фінансавання з'яўляецца грашовая патрымка дзіцячых прытулкаў аддзелам асветы і грамадскай апекі мінскага магістрата. На ўтрыманні аддзела знаходзілася 12 дзіцячых прытулкаў [2, л. 23].

Усяго дзіцячым прытулкам на ўтрыманне секцыя асветы і грамадскай апекі выдала на паўгода 70595 марак [3, л. 87]. У сярэднім кожнаму прытулку прыходзілася па 5883 маркі (па 980 марак у месяц), што з'яўлялася яўна недастатковым для нармальнага ўтрымання прытулка.

Дзіцячыя прытулкі г. Мінска дзяліліся на 3 катэгорыі, у аснову падзелу быў пакладзены нацыянальны крытэрый: польскія − 2 прытулкі, яўрэйскія − 3 прытулкі, беларускія – 7 прытулкаў [2, л. 24]. Усяго ў мінскіх прытулках знаходзілася 797 дзяцей узростам ад 7 да 13 гадоў [2, л. 25]. У Мінску на пачатак 1920 года па-за дзіцячымі прытулкамі налічвалася 342 дзяцей-сірот, 68 безнаглядных дзяцей, пры гэтым большасць з іх ніколі стала не пражывала ў горадзе (192 дзіцяці паходзіла з тэрыторыі Мінскай акругі) [4, л. 3]. На кожнага ў аддзеле асветы і грамадскай апекі складалася вызначаная рэгістрацыйная картка, у якую ўносіліся асабістыя дадзеныя дзіцяці (узрост, месца сталага жыхарства, бацькі, прычыны страты бацькоў, іншыя родзічы і іх месца жыхарства).

Па разрозненым архіўным дадзеным можна пабудаваць мадэль дзіцячага прытулка ў пачатку 1920 года. Дзіцячы прытулак размяшчаўся звычайна ў

некалькіх жылых і гаспадарчых пабудовах, меў свае прысядзібныя зямельныя ўладанні, агарод. Кіраўнічы і абслугоўваючы персанал складаў ад 4 (яўрэйскі прытулак па вуліцы Скобелеўская, 14) да 12 чалавек (беларускі прытулак у маёнтку Сляпянка) [2, л. 88]. З-за сітуацыі агульнага дэфіцыту педагагічных кадраў на беларускіх землях падчас польскай акупацыі, з-за невялікай заработнай платы, настаўнікі і выхавацелі не складалі большасць абслугоўваючага персаналу, што негатыўным чынам адбівалася на агульным узроўні выхаванасці і адукаванасці дзяцей.

Існавала шэраг дзіцячых прытулкаў, якія функцыянавалі дзякуючы прыватнаму фінансаванню або самафінансаванню. Так варта адзначыць дзіцячы прытулак у Дукштанскай гміне Браслаўскага павета, які фінансаваўся дзякуючы спецыяльна створанай апякунчай рады і таварыству дабрачыннасці. У ім знаходзілася 334 дзіцяці ад 9 да 13 гадоў [5, л. 3–3а]. Прытулак знаходзіўся ў складаным фінансавым становішчы. Дзякуючы намаганням таварыства дабрачыннасці ў Дукштах быў заснаваны прытулак на 20 дзяцей ад 1,5 да 8 гадоў. Планавалася будаўніцтва дзіцячага дома ў мястэчку Грыве Браслаўскага павета [6, л. 77].

Ажыццяўлялася фінансаванне дзіцячых прытулкаў з сродкаў розных духоўных арганізацый. Так Барунскі прытулак быў закладзены мясцовым ксёндзам Пятроўскім [7, с. 31]. Існаванне прытулку пры каталіцкім касцёле накладвала свой адбітак: навучанне ў ім вялося на польскай мове. Гэты факт негатыўна ўспрымаўся выхаванцамі непалякамі па нацыянальнай прыкмеце. На ўтрыманні Краснастоцкага праваслаўнага манастыра ў Гродна знаходзіўся беларускі прытулак для дзяцей-сірот, калек. Дадзены прытулак быў заснаваны ў 1916 годзе, у маёнтку «Кальцо», дзякуючы асігнаванням нямецкіх улад. З прыходам польскіх войск прытулак быў вымушаны перасяліцца ў Гродна. У прытулку выхоўвалася 102 дзіцяці-сірот. Фінансавую дапамогу ў памеры пяці тысяч марак прытулак атрымаў ад Рады Міністраў БНР [8, л. 38]. Ад школьнага аддзела Цэнтральнай Рады Віленшчыны і Гродзеншчыны аказвалася дапамога памерам дзесяць тысяч марак [9, с. 80].

Важнае значэнне ў функцыянаванні дзіцячых прытулкаў мела матэрыяльная дапамога амерыканскай місіі Чырвонага Крыжа ў Польшчы. У 1920 годзе газета «Echo Grodeńskie» паведамляла: «У Гродзенскім павеце быў пазначаны кіраўнік аддзелу Камітэта помачы дзецям Фелікс Гурскі, праз якога адбываецца дапамога дзецям ад Польскага амерыканскага камітэта» [10, с. 3]. Матэрыяльная дапамога амерыканскай місіі для дзяцей-сірот паступала ў выглядзе танных сняданкаў і абедаў – па 60 пфен у дзень. Дадзеную дапамогу маглі атрымаць сіроты да 15 гадоў [10, с. 4].

Наладжванне сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва сутыкалася са шматлікімі складанасцямі эканамічнага характару. Праблема дзяцей-сірот

заставалася нявырашанай. У сітуацыі страты бацькоў і родных, дзяржава і грамадства былі не ў стане забяспечыць для дзяцей-сірот ні нармальнага матэрыяльнага існавання, ні неабходнага ўзроўня выхавання і асветы, ні тым больш стварэння ўтульнага псіхалагічнага клімата.

**Літаратура**


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 804. – Воп. 1. – Спр. 32. Сведения о школьной сети города Минска и краткая справка о положении школьного дела в 1918-1919 году. – 45 л.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 603. – Воп. 1. – Спр. 2. Отчет о работе польской секции просвещения, списки сотрудников минских школ и переписка о воспитании детей в детских домах. 16 сентября 1919 – 30 декабря 1919. – 39 л.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 603. – Воп. 1. – Спр. 11. Переписка с культурно-просветительным отделом Белорусской военной комиссии, школами и приютами по финансовым вопросам (финансирование офицерских курсов, снабжение приютов и др.). 1919–14 июня 1920. – 341 л.
4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 603. – Воп. 1. – Спр. 9. Протоколы заседаний школьной комиссии при секции просвещения магистрата и сметы расходов на содержание школ. 1 января 1920 – 9 октября 1920. – 60 л.
5. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд 436. – Воп. 1. – Спр. 209. Списки детей сирот и переписка с опекунчей радой по оказанию им помощи. 22 января – 16 апреля 1920. – 32 л.
6. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд 436. – Воп. 1. – Спр. 77. Дело о строительстве детского дома в местечко Гриве Браславского повета. – 6 л.
7. *Багдановіч, Я.* На жыццёвым шляху. Успаміны. Мн., 1991.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. − Фонд 604. − Воп. 1. – Спр. 1. Выписки из протоколов заседаний Гроденской белорусской школьной рады. – 52 л.
9. Роля асобы ў жыцці і дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў ХХ ст. Мінск: Міжнародны адукацыйны цэнтр, 2000. – 136 с.
10. Беларускае слова. – 1920. – №47 (27 лістапада 1920).


## ОХРАНА И РЕСТАВРАЦИЯ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ В БЕЛАРУСИ В НАЧАЛЕ XXI ВЕКА


**П. В. Винакова**


Культура – это явление, которое формируется, копится и усовершенствуется веками и даже тысячелетиями. Все сегодняшние культурные процессы обусловлены своеобразным социальным опытом наших предков. Основой культуры любого народа является историко-культурное наследие. Республика Беларусь имеет значительный историко-культурный потенциал, представленный объектами архитектуры, градостроительства, памятниками истории, археологии, парковыми комплексами, народным и профессиональным искусством. Начало нового века, нового тысячелетия – это очень сложное время, время кардинальных преобразований и одновременно анализа опыта и наследия прошлых